# СІСТЭМА ПАЛІТЫЧНЫХ ПОГЛЯДАУ М. В. КАЯЛОВІЧА

**Д. І. Кузьма**

*Беларут нацыянальны тэхтчны утверсітэт*

Знакамггы гісторык, яскравы выкладчык, актыуны публіцыст і уплывовы грамадска-палітычны дзеяч Міхаіл Восіпавіч Каяловіч (1828-1891) паходзіу з духоунага асяроддзя польска-беларускага памежжа. Гэты вучоны, будучы прафесійным гісторыкам, надавау вялікае значэнне падзеям мшулага, перыядычна выкарыстоувау іх для доказу сваіх перакананняу. Адным з найбольш значных гістарычных перыядау ён лічыу эпоху Кіеускай Руи і менавіта адтуль выводзіу карані сваёй «рускасці». Значная частка творчай спадчыны гэтага вучонага да нашага часу так і не была уведзена у навуковы зварот. Працы ж шэрагу сучасных даследчыкау толькі часткова закранаюць насычаную і грунтоуную дзейнасць гэтай знакам^ай асобы.

Дзесяткі гадоу асноуным месцам яго працы была праваслауная Пецярбургская духоуная акадэмія. Знаходзячыся у сталіцы Расшскай імперыі М. В. Каяловіч прама шсау, што тут ён «займаецца беларускімі справамі» [1, с. 4]. Верагодна, вучоны меу на увазе як збор шфармацып аб тым, што адбывалася на яго радзіме, так і пошук шляхоу вырашэння заблытаных і складаных праблемных сггуацый, якія магчыма было вырашыць у гэтым горадзе, дзякуючы наяунасщ моцнага уздзеяння прэсы на грамадскую думку і асабістым сувязям з уплывовымі чыноУнікамі і грамадскімі дзеячамі. У сваіх успамінах яго вучань П. Жуковіч пісау, што з працау гэтага гісторыка людзі не толькі атрымлівалі звесткі аб мшулым, але і выкарыстоУвалі яго пстарычныя указанні пры вырашэнні царкоуных, дзяржауных і грамадскіх задач [2, с. 11].

Значную цшавасць прадстауляюць погляды М. В. Каяловіча на нацыянальныя і этнічныя працэсы у беларускіх губернях Расійскай імперыі.

Псторык выдзяляу некалькі тыпау народау. Так, да першага ён адному тыя народы, якія захоУвалі моцныя «нацыянальныя пачаткЬ» і самі Удзельнічалі у выпрацоуцы уласнай гісторыі. У іх асяроддзі існавала пэуная колькасць нацыянальных герояу - «падзвіжнікау народнай справы». Аб гэтых асобах захоувалася памяць у песнях, расказах, звычаях. Яны успрымаися як ідэальныя

вобразы для пераймання. Да такога народа ён адному жыхароу Цэнтральнай РасН [3, с. 23-24].

Да другога тыпу, згодна класіфікацыі М. В. Каяловіча, належала насельніцтва заходшх губерняу імперыі (беларуска-украшска-літоУскі рэпён). Тут «жыццёвыя сілы» былі вельмі знясілены. Вучоны пісау, што гэта адбывалася з-за частых прымусовых культурна-гістарычных пераарыентацый, пры якіх мела месца змена щэалау [3, с. 24].

У сваіх публіцыстычных артыкулах вучоны адзначау, што у заходшх губернях ^нуе не нейкі абстрактны, тэарэтычны, праектаваны заходнерускі народ, а сапраудны народ «адрозны у сваіх племянных асаблівасцях, але цэльны, адзіны у сва1х правах на жыццё і развіццё», якому патрэбна была дапамога» [4, с. 1]. Па меркаванні вучонага, аб'яднацца на такой «народнай аснове» маглі б не толькі велшаросы, украінцы, беларусы, літоУцы, а нават і тыя людзі, якія лічылі сябе палякамі, але змаглі правшьна зразумець сваё становішча у заходшх губернях.

М. В. Каяловіч пастаянна выкарыстоувау паняцце «народ». Пад ім часцей за усё вучоны разумеу асноуную масу жыхароу рэгіёна, выключаючы паланізаваных прадстаУнікоУ мясцовага дваранства і яурэйскае насельніцтва. Да яго даследчык адносіу людзей, якія здауна жы^ у заходніх губернях і яшя прыхільна ставіліся да манархічнай улады. Такім чынам, у сістэме поглядау гісторыка назірауся яскравы падзел мясцовага насельнщтва на «сва1х» - сялянства, частка мяшчан, людзей, яшя адносШ сябе да беларускага, л^оускага, украінскага ці «рускага» народау і «чужых» - палякау, палашзаванага высакароднага саслоуя і яурэяу [5, с. 4]. Псторык успрымау народ як адзшы моцны арганізм, у якога маецца свая душа, і які, як і усе шшыя жывыя істоты, мог загшуць. Але пад гібеллю народа даследчык разумеу змену культурных, рэлМйных, этшчных асноу яго жыццядзейнасці.

Сучасны маплёусш гісторык І. Марзалюк, які звярнууся да вывучэння гістарычных канцэпцый М. В. Каяловіча, выдзеліу тры УзроУні нацыянальнай свядомасці вывучаемай намі асобы: агульнарускага адзінства, заходнерускай «пстарычнай нацыі» і беларускасщ [6, с. 16-17].

Прадстауляюць цшавасць разважанні М.В. Каяловіча аб щэях сепаратызму, якія, на думку вучонага, не сумяшчальны з самім характарам праваслаунай адукацыі. Прапагандуючы ідэю стварэння духоунай вышэйшай навучальнай установы на беларускіх землях, ён шсау: «У духоунай акадэміі такая перавага тэарэтычнай

адукацып, такое панаванне щэй вышэйшага парадку - сусветных, міравых, што усяляш сепаратызм, як выражэнне ідэй шжэйшага парадку, непазбежна павінен знікаць» [7, с. 834]. Для умацавання пазщый Праваслаунай царквы і аслаблення уплыву «польскага элемента» М. Каяловіч актыуна прапагандавау ідэю аднаулення брацтвау. Ён прымау актыуны удзел у стварэнш у 1863 г. у Пецярбурзе «Заходнерускага брацтва» [9].

Для М. В. Каяловіча былі характэрны большай часткай негатыуныя адносшы да палякау. Ён пісау, што нармальна ставщца толькі да чыстага народнага «польскага элементу». Вучоны мог лічыць яго зусім бясшкодным у заходшх губернях тольш у тым выпадку, калі б той быу пазбаулены шляхецкіх, езуіцкіх і рэлМйных асаблівасцей [4, с. 2].

Псторык адзначау, што людзі, яшя слаба ведалі заходні рэгіён, бачы^ тут толькі польскую высакароднасць і шляхецтва, але у той жа час за імі не маги заувважыць і не заувважалі карэннага, спрадвечнага і адрознага ад Польшчы «народа лггоускага, беларускага, малерасшскага». М. В. Каяловіч заклікау сваіх чытачоу прыняць яго «народны« пункт погляду, бачыць шырокую этнічную карцшу. Яго погляды нават сталі называць «дэмакратычнымі», што у тыя часы, улічваючы элітарнасць кірауніцтва Расійскай імперыі, мела пэуны негатыуны кантэкст [4, с. 2].

М. В. Каяловіч шмат публщыстычных артыкулау прысвяціу аналізу прычын, падзей і наступствау паустання 1863-1864 гг. Напрыклад, ён звяртау увагу на адрозненні гэтага узброенага выступлення на тэрыторып Польшчы і у заходніх губернях РасН. Вучоны адзначау, што у апошнім рэгіёне вынікам «мяцяжу» было б тольш бясплоднае насшле [10, с. 1].

Псторык звяртау увагу на вузкасць сацыяльнай базы для паустанцау, паказвау наяунасць вялшай пропасці паміж асноунай часткай жыхароу рэпёна, і тымі, хто «падымау зброю», выяуляу прычыны слабай падтрымш паустання з боку беларускага вясковага насельніцтва. Перакананні мясцовых сялян не дазвалялі успрымаць паустанцау са станоучага боку, а тым больш быць гатовымі аказваць ім добраахвотную дапамогу. На старонках перыядычнага друку Каяловіч прыводзіу факты аб тым, што сяляне часта даносШ уладам пра з'яуленне паустанцау, яшя рабавалі і палілі сялянскую маёмасць [10, с. 2]. У такой сггуацып узшкала патрэба у аргашзацып узброеных атрадау самаабароны з вясковых жыхароу. М. В. Каяловіч у сваіх артыкулах адным з першых выказау думку аб неабходнасщ стварэння з боку улад народнага апалчэння, якое барашла б мясцовае насельнщтва ад паустанцау [5, с. 5].

Щкавыя паралелі паміж К. КаліноУскім і М. Каяловічам правёу беларуска-польскі даследчык А. Латышонак. Ён пісау, што першы з іх асуджау тольш «блапх паноу», а другі ж сцвярджау, што «дзеля дабра беларускага народа трэба пазбавщца ад умх паноу, гэта значыць, ад палякау-каталшоу: «Delenda est Carthago! - яны павінны збірацца дахаты, у сваю сапраудную Польшчу» [11, с. 386].

Ташм чынам, М. В. Каяловіч пакінуУ след у псторып Беларусі не толькі як псторык, але і як палітычны щэолаг, які шукау шляхі вырашэння нацыянальных, рэлігійных і грамадскіх праблем, грунтуючыся на сва1х агульнарускіх і манархічных поглядах. Яго ідэі працяглы час былі запатрабаванымі і іх актыуна выкарыстоувалі у сваёй дзейнасщ прадстаунікі улады і праваслаунай штэлЬ генцыі у беларускім рэпёне.

**Л1тарадура**


1. *Коялович, М. О.* Давайте книг для западно-русского народа или бросьте все заботы об открытии для него школ / М. О. Коялович // День. - 1863. - № 6. - С. 2-4.

2. *Жукович, П. Н.* Речь / П. Н. Жукович // Памяти покойного профессора. - СПб., 1895. - С. 11-12.

3. *Коялович, М. О.* Историческое призвание западно-русского православного духовенства / М. О. Коялович // Литовские епархиальные ведомости. - 1863. - № 1. - С. 22-32; № 2 - С. 63-68.

4. *Коялович, М. О.* Что нужно западной России? / М. О. Коялович // День. - 1863. - № 10. - С. 1-2.

5. *Коялович, М.* О. Народное движение в Западной России / М. О. Коялович // День. - 1863. - № 20. - С. 3-7.

6. *Марзалюк, I. А.* Міфы «адраджэнскай» пстарыяграфп Беларусь манаграфія / I. А. Марзалюк. - Маплёу, 2009. - 148 с.

7. *Коялович, М. О.* Поездка в западную Россию / М. О. Коялович. - СПб., 1886. - 37 с.

8. *Коялович, М. О.* История проектов об учреждении в Вильно духовной академии и современная нужда в ней / М. О. Коялович // Церковный вестник. - 1889. - № 47. - С. 793-794; № 48. - С. 813-814; № 49. - С. 833-836.

9. Материалы для истории Западно-русского общества. (Создаваемого?) Андреем Парфеновичем Заблоцким-Десятовским для борьбы с польским влиянием и для подъема Русских начал в Северо-Западном крае // Российский государственный исторический архив (РГИА). - Фонд 940. - Оп. 1. - Д. 4. - Л. 1-42.

10. *Коялович, М. О.* По поводу указа Сената о даровании амнистии поднявшим оружие против правительства в западных губерниях / М. О. Коялович // День. - 1863. - № 15. - С. 1-5.

11. *Латышонак, А.* Нацыянальнасць - Беларус / А. Латышонак; нав. рэд. А. Пашкевіч. - ВШльнюс, 2009. - 558 с.